## ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ВЕРША М. ТАНКА «ПРЫТЧА ПРА ХЛЕБ»

**А.А. Крукава**

Навуковы кіраўнік: В.М. Шавель

Гісторыкі лічаць, што хлеб на стале чалавека з'явіўся вельмі даўно. Хлебнае зерне стала ежай больш як 10 тыс. гадоў таму. Слова «хлеб» паходзіць ад старажытнаславянскай мовы, у аснове яго – індаеўрапейская форма «кхлойбос» ці «схлойбхос».

Хлеб – наша жыццё. Таму людзі спрадвеку яго цанілі і берaглі. Пацвярджэнне таму – шматлікія творы фальклору: прыказкі, прымаўкі, песні. Павагу да хлеба выказвалі і выказваюць пісьменнікі і мастакі (карціны І. Шышкіна «Жыта», М. Савіцкага «Хлеб», «Зерне»). Каштоўнасць хлеба і яго вартасць на нашым стале выражаецца не толькі яго гістарычнай і харчовай значнасцю. Хлеб – гэта і цяжар чалавечай працы, таму пашана і любоў да яго – абавязак і гонар кожнага чалавека.

Свае адносіны да хлеба М. Танк абгрунтаваў і абараніў у «Прытчы пра хлеб».

Прытча – невялікі іншасказальны твор павучальнага характару, які належыць да ліра-эпічнага жанру. Гэты жанр літаратуры пашыраны ў Бібліі і творах фальклору. Звяртаючыся да прытчы як жанру, аўтар падкрэслівае святасць хлеба для кожнага чалавека. Прытча імкнецца звярнуць і засяродзіць увагу чытача на задуме аўтара. У такім творы інтэлектуальны элемент пераважае над вобразным. Прытча прымушае нас думаць і рабіць высновы з прапанаваных жыццёвых сітуацый.

Сюжэт твора складае аповед аб тым, як бяздумны чалавек, пасварыўшыся з хлебам, на сваім горкім вопыце зразумеў немагчымасць жыцця без «лусты спорай».

Па-мастацку яскрава і непаўторна М. Танк малюе два вобразы – Хлеба і Вандроўніка, адносіны аўтара да якіх неадназначныя.

Пра адмоўныя аўтарскія адносіны да Вандроўніка, які не ведае цаны хлебу, сведчыць слоўная характарыстыка, дадзеная свайму герою М. Танкам. У вершаваных радках выкарыстаны сінанімічны рад: плесціся, шкандыбаць, брысці. Словы гэтыя маюць эмацыянальна-зніжанае і грубаватае адценне. У вобразе аднаго чалавека аўтар паказаў неразумных, непрактычных, адарваных ад сваіх каранёў людзей, якія не прывыклі адказваць за свае ўчынкі. У вобразе Хлеба аўтар уславіў народную мудрасць і працавітасць, носьбітамі якіх з'яўляюцца сяляне. Вызначаюць павагу да Хлеба эпітэты «духмяны» і «цудоўны».

Вандроўнік зразумеў сваю памылку і значнасць сэнсу слоў, якія сказаў яму Хлеб: «Цябе нясу я». Гэтыя вобразы глыбока сімвалічныя: Вандроўнік увасабляе чалавечую бяздумнасць, непрадбачлівасць, а Хлеб – плён цяжкай працы, які неабходна берагчы і паважаць.

Цэнтральная тэма верша – хлеб і беражлівыя адносіны да яго. Ідэя твора – у сцвярджэнні, што людзі разумеюць значнасць хлеба толькі тады, калі яго ў іх няма.

Для раскрыцця тэмы і ўвасаблення ідэі аўтар шырока выкарыстоўвае ў творы вобразна-выяўленчыя сродкі: эпітэты – «спорая луста», параўнанне – «хлеб-брат», зваротак – «дзівак»; сам вобраз Хлеба з'яўляецца алегарычным.

У творы сустракаюцца разнастайныя паводле структуры, і мэты выказвання сказы. Пабуджальныя надаюць вершу больш эмацыянальнай увагі і значэння. Для паказу няўпэўненасці Вандроўніка аўтар ужывае сказы з пытальнай інтанацыяй. У вершы шмат аднародных членаў сказа, што падкрэслівае багацце яго мовы. Вялікая колькасць дзеясловаў забяспечвае хуткую змену падзей у творы.

Хлеб – сімвал дабрабыту, чалавечай дабрыні, нашай краіны. Хлебам-соллю мы сустракаем дарагіх гасцей. Можна пагадзіцца з выказваннем В. Карамзіна, што хлеб увабраў у сябе ўсенародную працу, сілу і моц чалавека.

## ВОБРАЗ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

**А.А. Макейчык**

Навуковы кіраўнік: А.В. Трафімчык, кандыдат гістарычных навук

Жыццё і дзейнасць славутай асветніцы Еўфрасінні Полацкай натхняюць беларускіх паэтаў на ўслаўленне самаахвярнага подзвігу ў імя народа, многія іх творы прысвечаны ўвекавечанню вобраза Еўфрасінні. Еўфрасіння Полацкая (у міру – Прадслава) – адна з прадвесніц і першых дзеячаў усходне-славянскага гуманізму, абуджаных магутным паўднёвым кірыла-мяфодзьеўскім уплывам, які пусціў глыбокае карэнне на беларускіх землях.

Вельмі рана, як гэта вядома нам з «Жыцця Еўфрасінні Полацкай», ступіла яна на шлях пошукаў ісціны і праведнасці.

> Мінуласць ляжыць над магільным вянком,
> над тымі, што ў смерці застылі,
> ззяе святлом праз цемру вякоў
> святое імя Еўфрасіння.